# Рецензии

# Рэцэнзii

# Reviews

*Выкипел Б., Выкипелова Т., Карликова Г., Янышкова И., Бочек В.* **Церковнославянское наследие в старо-, средне- и новочешском языке**. Прага : NLN, 2022. 268 с. (на чеш.).

*Выкіпел Б., Выкіпелава Т., Карлікава Г., Янышкава І., Бочэк В.* **Царкоўнаславянская спадчына ў стара-, сярэдня- і новачэшскай мове.** Прага : NLN, 2022. 268 с. (на чэш.).

*Vykypěl B., Vykypělová T., Karlíková H., Janyšková I., Boček V.* **Církevněslovanské dědictví ve staré, střední a nové češtině.** Praha : NLN, 2022. 268 s.

Манаграфія з'яўляецца калектыўнай працай, падрыхтаванай навуковымі супрацоўнікамі этымалагічнага аддзялення Інстытута чэшскай мовы Акадэміі навук Чэшскай рэспублікі (Брно). Тэма даследавання была абрана не выпадкова. Пачынаючы з 1989 г. у аддзяленні вялася работа над выданнем «Этымалагічны слоўнік старaславянскай мовы» («Etymologický slovník jazyka staroslověnského»), якая паспяхова была завершана ў 2022 г. Акрамя таго, годам раней пабачыла свет манаграфія В. Бочка, І. Янышкавай, Г. Карлікавай і Б. Выкіпела «Старaславянская спадчына ў старачэшскай мове» («Staroslověnské dědictví ve staré češtině»)[1]. Рэцэнзуемае выданне з'яўляецца «працягам вышэйзгаданай папярэдняй працы»[2] (с. 6), пра што сведчыць тэматычнае, структурнае і метадалагічнае падабенства, а таксама частковае супадзенне выкарыстанага моўнага матэрыялу. На наш погляд, абодва даследаванні заслугоўваюць увагі, яны шмат у чым сугучныя і ўзаемадапаўняльныя.

Прадметам вывучэння дадзенай манаграфіі з'яўляецца ўплыў царкоўнаславянскай мовы на чэшскую мову ў розныя перыяды яе развіцця. Як пазначана ў прадмове да выдання, кірыламяфодзіеўская традыцыя мела прамое і непрамое дачыненне да чэшскай культуры і гісторыі (с. 5). Місіянерская дзейнасць братоў Кірылы і Мяфодзія была звязана з хрысціянізацыяй Вялікай Маравіі і пашырэннем старaславянскай пісьменнасці сярод заходніх славян, найперш чэхаў і славакаў. Пры дадзеных абставінах старaславянская мова ўплывала на чэшскую мову непасрэдна. У пазнейшы час узніклі ўмовы для непрамога ўздзеяння, якое адбывалася праз іншыя ўсходне- і паўднёваславянскія мовы, дзе пісьменнасць развілася на аснове старaславянскай пісьмова-кніжнай традыцыі. Прамы ўплыў быў даследаваны ў кнізе «Старaславянская спадчына ў старачэшскай мове», дзе аналізаваліся патэнцыяльныя палеаславянізмы (*potenciální paleoslovenismy*). Непрамы ўплыў суадносіцца з царкоўнаславянскай спадчынай, вывучэнне якой уключае разгляд патэнцыяльных царкоўнаславянізмаў (*potenciální církevní slavismy*). Гэтай тэме прысвечана рэцэнзуемая манаграфія.

Праблема, узнятая чэшскімі даследчыкамі, з'яўляецца складанай па дзвюх прычынах. Па-першае, непасрэдны ўплыў старaславянскай мовы на чэшскую мову быў непрацяглым і фрагментарным, ён абмяжоўваўся візантыйскай місіяй 860-х гг., дзейнасцю Мяфодзія ў якасці архібіскупа ў 870–885 гг. і дасягненнямі Сазаўскага кляштара па захаванні старaславянскіх традыцый у XI ст. Паводле высноў з папярэдняй манаграфіі, нават прамы ўплыў старaславянскай мовы на старачэшскую мову быў даволі слабым. Па-другое, умовы пранікнення царкоўнаславянскіх традыцый у чэшскую культурную прастору былі яшчэ менш спрыяльнымі. Можна гаварыць толькі пра непрамыя шляхі іх засваення пры пасрэдніцтве ўсходне- і паўднёваславянскіх моў. Такім чынам, аўтары сутыкнуліся з няпростай задачай.

[1] *Алексеевич А. В.* [Рецензия] // Славяноведение. 2023. № 2. С. 136–139. Рец. на кн.: Boček V., Janyšková I., Karlíková H., Vykypěl B. Staroslověnské dědictví ve staré češtině . Praha : NLN, 2021. 304 s.

[2] Тут і далей пераклад наш – *Г. А.*

CC BY NC

Па сваёй структуры манаграфія адпавядае класічным працам па гісторыі мовы, дзе главы размешчаны згодна з храналагічным прынцыпам. Кніга складаецца з кароткай прадмовы і чатырох глаў: «Перадгісторыя», «Старачэшская мова», «Сярэднячэшская мова» і «Новачэшская мова».

Самай невялікай па аб'ёме з'яўляецца першая глава «Перадгісторыя» (аўтары Б. Выкіпел, Г. Карлікава, І. Янышкава, В. Бочэк), прысвечаная разгляду праблемы ў дапісьмовы перыяд існавання чэшскай мовы. Патэнцыяльны царкоўнаславянскі ўплыў разглядаецца ў кантэксце верагодных чэшска-ўсходнеславянскіх сувязей: кантактаў паміж Сазаўскім кляштарам і духоўна-асветніцкімі цэнтрамі Старажытнай Русі ў XI ст., прысутнасці рускіх духоўных асоб пры двары Вацлава II у XIII ст. Што тычыцца моўнага матэрыялу, аўтары разглядаюць у якасці патэнцыяльных царкоўнаславянізмаў некалькі слоў: *Dimitr*, *Ivan*, *Prokop*, *utěšitel*, *podrah*, *bezpokojie*, *ozrač* (*ozračstvo*), *hramotina*. Але толькі апошняе з іх можа быць аднесена да царкоўнаславянізмаў (параўнаем са старажытнаславянскім словам *грамота*). Адначасова не выключаецца магчымаць, што старажытначэшскае слова *hramotina* з'яўляецца запазычаннем усходнеславянскага паходжання (параўнаем са старажытнарускім словам *грамота*).

Другая глава «Старачэшская мова» складаецца з чатырох раздзелаў. Паводле храналогіі развіццё старачэшскай мовы адбывалася ў XIV–XV стст., калі фарміравалася чэшская нацыянальная пісьменнасць. Уплыў царкоўнаславянскай мовы традыцыйна звязаны з дзейнасцю Эмаўзскага кляштара ў Празе, пры якім ствараліся помнікі на царкоўнаславянскай мове ў харвацкай рэдакцыі. Трэба адзначыць, што ў манаграфіі паслядоўна раздзяляюцца моўны ўплыў (*jazykový vliv*) і тэкставы ўплыў (*textový vliv*). Апошні, як правіла, закранае толькі канкрэтны старачэшскі тэкст, а выяўленыя ў ім запазычанні не сустракаюцца ў іншых помніках. Моўны ўплыў з'яўляецца больш устойлівым, запазычаныя словы трывала ўваходзяць у лексічны склад мовы (с. 21). З улікам прапанаванага вышэй падзелу напісаны першы і другі раздзелы гэтай главы. Першы раздзел «Царкоўнаславянізмы ў старачэшскай мове» (аўтары Б. Выкіпел, Г. Карлікава, І. Янышкава, В. Бочэк) уяўляе сабой слоўнік, які ўтрымлівае гісторыка-этымалагічны аналіз 94 лексічных (у 92 слоўнікавых артыкулах) і 3 нелексічных[3] патэнцыяльных царкоўнаславянізмаў. Па выніках аналітычнай часткі даследавання былі зроблены наступныя высновы. З прааналізаваных 97 патэнцыяльных царкоўнаславянізмаў 65 імі не з'яўляюцца. Астатнія 32 лексемы былі размеркаваны па трох групах: 1) *možná*, дзе царкоўнаславянскае паходжанне разглядаецца як адно з магчымых (27 слоў); 2) *asi*, дзе царкоўнаславянскае паходжанне з'яўляецца верагодным (4 словы); 3) *ano*, дзе царкоўнаславянскае паходжанне можна лічыць збольшага даказаным (1 слова). Другі раздзел «Уплыў царкоўнаславянскага біблейскага перакладу на старачэшскі біблейскі пераклад» (аўтары Б. Выкіпел, Т. Выкіпелава) прысвечаны разгляду старачэшскіх рэлігійных тэкстаў, сярод якіх псалтыры («Žaltář Kapitulní», «Žaltář Klementinský»), біблії («Bible Hlaholská», «Bible Litoměřicko-Třeboňská»), евангеллі («Evangeliář Čtenie kněžě Benešovy», «Evangeliář Čtenie zimnieho času», «Evangeliář Olomoucký», «Evangeliář Kapitulní») і інш. У раздзеле галоўным чынам былі пераасэнсаваны ранейшыя ўяўленні даследчыкаў адносна таго, як «эмаўзскі[4] царкоўнаславянскі пераклад паўплываў на стылізацыю старачэшскага біблейскага тэксту» (с. 69). У трэцім раздзеле «Канцэптуальныя ўплывы царкоўнаславянскай мовы на старачэшскую мову» (аўтары Б. Выкіпел, Т. Выкіпелава) акрэслены ідэі, якія маглі б выспець у чэшскім культурным асяроддзі дзякуючы дзейнасці Эмаўзскага кляштара (напрыклад, павелічэнне колькасці перакладаў на чэшскую мову як мову народную, вывучэнне славянскіх моў, развіццё дыякрытычнага правапісу і інш). У цэлым аўтары прыходзяць да высновы аб тым, што царкоўнаславянская пісьменнасць магла спрыяць фарміраванню некаторых ідэй, але не была крыніцай іх зараджэння. Калі папярэднія тры раздзелы ахопліваюць падзеі XIV ст., то чацвёрты, апошні раздзел «Водгукі і прэлюдыя» (аўтары Б. Выкіпел, Т. Выкіпелава) прысвечаны XV ст. Гэты перыяд у чэшскай гісторыі вядомы найперш гусіцкімі войнамі, даследчыкі фіксуюць рэдкія факты захавання царкоўнаславянскіх традыцый і называюць XV ст. мастом паміж актыўнай дзейнасцю эмаўзскіх асветнікаў другой паловы XIV ст. і пасіўнай рэфлексіяй царкоўнаславянскай спадчыны ў XVI ст. (с. 101).

Трэцяя глава манаграфіі «Сярэднячэшская мова» (аўтары Б. Выкіпел, Т. Выкіпелава) змяшчае два раздзелы. Храналагічна сярэднячэшская мова развівалася з XVI па XVIII ст. У чэшскай гісторыі гэта была няпростая, маласпрыяльная для царкоўнаславянскіх уплываў эпоха. Як пазначаюць самі аўтары, «гэта глава мае выгляд збірання фрагментаў пра царкоўнаславянскую мову ў чэшскіх землях тых часоў» (с. 105). Першы раздзел «Czechowie nie wiedzą» («Чэхі не ведаюць») на-

[3]Найчасцей царкоўнаславянскі ўплыў выяўляецца ў лексіцы, але не абмяжоўваецца ёй. Яго прыметы можна заўважыць у словаўтварэнні і граматыцы старачэшскай мовы. Мяркуецца, што царкоўнаславянская мова магла паўплываць на прадуктыўнасць суфікса *-ník-*, выкарыстанне канструкцый з давальным самастойным, ужыванне канчатка *-a* (замест больш пашыранага *-y*) у назоўнікаў з асновай на *ǒ у форме мужчынскага роду назоўнага і вінавальнага склону парнага ліку.

[4]Звязана з дзейнасцю Эмаўзскага кляштара (Прага). – *Г. А.*

званы словамі С. Буднага, які пісаў, што чэшскі народ не ведае «славянскага», гэта значыць царкоўнаславянскага, перакладу Бібліі. Тым не менш далей пералічваюцца нешматлікія факты, эпізоды, згадкі, асобы, якія мелі дачыненне да царкоўнаславянскай спадчыны ў чэшскай культурнай прасторы XVI ст. Асаблівую цікавасць выклікаюць асобы Ф. Скарыны і М. Бэнэшаўскага. На думку аўтараў, дзейнасць беларускага асветніка ў Празе (1517–1519 і 1535–1539 гг.) не атрымала належнага рэзанансу ў чэшскім грамадстве праз сваю кароткачасовасць. Нягледзячы на гэта, «верагодны скарынаўскі след» (с. 106) трэба бачыць у свецкім значэнні слова *gospodin* ‘пан, валадар’, зафіксаваным у выданні «Чэшская хроніка» В. Гайка (1541). Старажытначэшскае слова *hospodin* ужывалася ў значэнні ‘Бог, Гасподзь; Ісус, Сын Божы’, новая семантыка магла з’явіцца пад царкоўнаславянскім уплывам праз пасрэдніцтва Ф. Скарыны. Іншай асобай, якая прыцягнула ўвагу даследчыкаў, з’яўляецца М. Бэнэшаўскі. Яго праца «Кніжка слоў чэшскіх» («Knížka slov českých») змяшчае лексічны матэрыял царкоўнаславянскага паходжання. Верагодна, крыніцай запазычанняў была царкоўнаславянская мова ва ўкраінскай рэдакцыі. У другім раздзеле «Пасля Белай гары» высвятляюцца прычыны, па якіх царкоўнаславянская спадчына застаецца незапатрабаванай з 1620 па 1770-я гг. Нешматлікія згадкі (іх выказвалі Я. А. Коменскі, Б. Балбін) пра богаслужэнні на царкоўнаславянскай мове, заведзеныя Кірылам і Мяфодзіем, з’яўляюцца фрагментарнымі.

Чацвёртая глава «Новачэшская мова» (аўтары Б. Выкіпел, Т. Выкіпелава) прысвечана розным аспектам даследавання праблемы з канца XVIII ст. па сённяшні дзень. У першым раздзеле «Царкоўнаславянізмы ў новачэшскай мове» падаецца этымалагічны разбор 59 патэнцыяльных царкоўнаславянізмаў. Вылучаныя словы былі размеркаваны па двух групах. У першую групу ўвайшлі царкоўнаславянізмы, запазычаныя праз рускую ці іншыя славянскія мовы (45 слоў), у другую групу – царкоўнаславянізмы, засвоеныя без пасрэдніцтва іншых моў (14 слоў). Дадаткова былі паказаны «ахоп ці сіла царкоўнаславянскага ўздзеяння» (с. 135), інакш кажучы, даследчыкі паспрабавалі ацаніць устойлівасць запазычанняў у чэшскай лексічнай сістэме. Высновы праведзенага аналізу наступныя: царкоўнаславянскі ўплыў на новачэшскую мову быў маргінальным і непаслядоўным. У другім раздзеле «Кірыліца для чэшскай мовы» апісваюцца спробы ўжывання кірылічнага пісьма некаторымі прадстаўнікамі чэшскага нацыянальнага адраджэння (А. Я. Пухмайерам, Ф. Я. Езберам, Ё. Кашпарам, З. Рэйхлам і інш.). На думку аўтараў, гэтыя спробы варта разглядаць у межах індывідуальных практык, якія не пакінулі ніякіх слядоў у графічнай сістэме чэшскай мовы, заснаванай на лацінцы. Ідэі выкарыстання кірыліцы, відавочна, узніклі пад уплывам рускай ці агульнаславянскай культуры, няма падстаў бачыць у гэтым уплыў царкоўнаславянскай мовы. Трэці раздзел «Францішак Новатны з Лужэ» прысвечаны аднаму з чэшскіх дзеячаў нацыянальнага адраджэння. Найбольшую цікавасць у аўтараў манаграфіі выклікае яго пераклад Евангелля на чэшскую мову (1810–1811 гг.), выкананы з выкарыстаннем не толькі лацінскіх і грэчаскіх тэкстаў, але і царкоўнаславянскага тэкста. Нягледзячы на тое што гэты пераклад быў «прыватнай ініцыятывай» (с. 143), якая не мела паслядоўнікаў, сам факт яго існавання сведчыць пра магчымасць прамога царкоўнаславянскага ўплыву на чэшскую пісьменнасць. У чацвёртым раздзеле «Царкоўнаславянская мова як узор» разглядаюцца ідэі тагачасных чэшскіх інтэлектуалаў (Ё. Ф. Шумаўскага, Ё. Добраўскага) адносна значэння царкоўнаславянскай мовы для развіцця іншых славянскіх моў, у прыватнасці чэшскай. Пятым раздзелам «Светапоглядныя аспекты палеаславістычнай тэматыкі» завяршаецца не толькі дадзеная глава, але ўся папярэдняя частка кнігі. Аўтары даследуюць, якім чынам кірыламяфодзіеўская традыцыя і стараславянская спадчына асэнсоўваліся ў чэшскім навуковым дыскурсе, найперш у мовазнаўстве, літаратуразнаўстве і гісторыі.

Манаграфія дапоўнена публікацыяй Э. М. Грдзінавай «Каралева ці жабрачка? Рэлігійная тэрміналогія чэшскага праваслаўя: яе паходжанне, характар і перспектывы». Зараджэнне праваслаўя ў Чэхіі адбылося напрыканцы XIX ст. Новае набажэнства набыло папулярнасць пасля 1918 г. і развіваецца па сённяшні дзень. Асаблівая ўвага ў даследаванні была звернута на фарміраванне праваслаўнай тэрміналогіі, якая ўзбагачалася ў тым ліку за кошт царкоўнаславянізмаў. Нягледзячы на маргінальны характар праваслаўнай лексікі ў чэшскай мове, яна з’яўляецца цікавым аб’ектам вывучэння з пункту гледжання актуальнага царкоўнаславянскага ўплыву на сучасную чэшскую мову.

У выданне ўключаны два дадаткі, спісы скарачэнняў і бібліяграфія. Першы дадатак «Фляйшгансава афера» змяшчае перадрукаваную перапіску паміж чэшскімі навукоўцамі (В. Фляйшгансам, Ё. Курцам, Ё. Вашыцам, Я. Славікам). У другім дадатку «Здэнек Каліста *contra* Раман Якабсон» апублікаваны навукова-крытычныя развагі чэшскага гісторыка З. Калісты, якія захоўваюцца ў рукапісным выглядзе ў адным з архіваў. Тэксты, змешчаныя ў дадатках, з’яўляюцца добрай ілюстрацыяй дыскусій, якія вяліся ў 1930–40-я гг. вакол тэмы стараславянскага ўплыву на чэшскую мову і месца «кірыламяфодзіеўства» (*cyrilometodějství*) у развіцці чэшскай нацыянальнай свядомасці.

На жаль, у манаграфіі адсутнічае частка «Заключэнне». Прамежкавыя высновы ўтрымліваюцца ў кожнай главе і некаторых раздзелах. З папярэдняга апісання бачна, што ў даследаванні ахоплены амаль увесь гістарычны перыяд існавання чэшскага народа, аўтарамі сабраны і прааналізаваны вялікі аб'ём як моўнага матэрыялу, так і навукова-крытычнай літаратуры па тэме. Зрэшты, сама тэма, разгледжаная ў манаграфіі, з'яўляецца складанай, дыскусійнай і мае працяглую гісторыю. У сувязі з гэтым у выданні вельмі не хапае заключнай часткі, у якой бы рэзюміраваліся атрыманыя на кожным этапе даследавання вынікі і адлюстроўвалася пазіцыя аўтараў па дадзеным пытанні.

Разгледжанае выданне з'яўляецца грунтоўнай філалагічнай працай, у якой прадэманстраваны інтэрдысцыплінарны падыход да вывучэння навуковай праблемы на сумежжы розных гуманітарных дысцыплін (лінгвістыкі, літаратуразнаўства, перакладазнаўства, гісторыі). Манаграфія будзе цікавай найперш для славістаў, гісторыкаў мовы і этымолагаў.

***Г. В. Алексяевіч***[5]

[5]*Анна Викторовна Алексеевич* – кандидат филологических наук; старший научный сотрудник сектора этнолингвистики и фольклора отделения славистики и теории языка Института языкознания имени Якуба Коласа Центра исследований белорусской культуры, языка и литературы НАН Беларуси.

*Ганна Віктараўна Алексяевіч* – кандыдат філалагічных навук; старшы навуковы супрацоўнік сектара этналінгвістыкі і фальклору аддзела славістыкі і тэорыі мовы Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.

*Hanna V. Aleksiayevich*, PhD (philology); senior researcher at the sector of ethnolinguistics and folklore at the department of Slavic studies and language theory, Yakub Kolas Institute of Linguistics of the Centre for the Belarusian Culture, Language and Literature Researches of the National Academy of Sciences of Belarus.

E-mail: *hanaaleks@gmail.com*